# ... Як з божых далоняў сышоў чалавек

Юрый Іванавіч Боўда невысокага росту, камлюкаваты, моцны. Горда пасаджаная галава. Адкрыты твар. З-пад густых броваў глядзяць глыбокія вочы. Погляд іх нейкі летуценны, хоць па сваёй натуры Юрый Іванавіч чалавек уважлівы. Ганчар не павінен быць іншым. Тым больш такі, як Боўда. На нядаўнім усебеларускім свяце "Ганчарны круг" Юрый Іванавіч быў прызнаны кампетэнтным журы лепшым майстрам у жанры мастацкай керамікі. Але майстар робіць не толькі дзівосныя керамічныя рэчы, якія з'яўляюцца плодам яго багатай фантазіі і таленту. Вельмі тонкай работы ўсялякія боўдаўскія вазы, яго гладышы. Пра апошнія жартуюць: "У такім гладышы любы джын захоча пасядзець".

Юрый Іванавіч бярэ гліняны бохан, адразае ад яго лусту і пачынае камячыць яе ў руках. Рукі ў Боўды моцныя, але і ў той жа час пяшчотныя, яны нібы перадаюць сваю цеплыню гліне.

— Пасля таго, як нарыхтуеш гліну, — расказвае майстар, — яна спее не адзін год у спецыяльных буртах. Працую толькі з той глінай, якая мае высокую спеласць.

Юрый Іванавіч кладзе камяк гліны на ганчарны круг, садзіцца за яго і пачынае працаваць.

*Ганчар, ты — натхнення*
*свайго гаспадар.*
*Сам Бог табе даў гэты*
*сонечны дар.*
*Шчыруеш — і з гліны ў*
*натхнёных руках*
*Народзіцца зноўку сама*
*прыгажосць.*
*Было так заўсёды ў мінулых*
*вяках —*
*У продкаў далёкіх. І сёння*
*так ёсць.*

Упершыню Боўда ўбачыў ганчарны круг у сваім юнацтве. Жыў ён тады ў вёсцы Цітаўка, якая цяпер з'яўляецца прадмесцем Бабруйска. Атрымалася так, што пасля заканчэння сярэдняй школы хлопцу не ўдалося стаць студэнтам і трэба было шукаць свой хлеб.

— У Цітаўцы ёсць керамічны цэх ад райпрамкамбіната, — сказалі яму. — Там патрэбны фармоўшчык.

Юрый Боўда прыйшоў у цэх, дзе працавалі 7 чалавек. Тут рабілі і сем найменняў гліняных вырабаў. Яго прынялі вучнем фармоўшчыка. Юрый вучыўся не толькі фармаванню вырабаў з гліны, але і абпальваць іх, рабіць глазуроўку. Настаўнікі ў хлопца былі выдатныя. Самы старэйшы і вопытны з іх быў Міхаіл Іванавіч Ламака. Сямідзесяцігадовы майстар ведаў сапраўдныя тайны ганчарства і ахвотна адкрываў іх Юрыю. Боўда аказаўся таленавітым вучнем. Хутка ён мог зрабіць гладыш за 58 секунд. Юрый Іванавіч — менавіта з тых творчых людзей, пра якіх кажуць, што яны маюць адну, але палымяную страсць. Пасля цэха керамікі, які перастаў існаваць, Боўда, сапраўдны самародак ганчарства, стаў працаваць майстрам сувенірнага цэха ў Бабруйскім мастацкім вучылішчы. Затым скончыў мастацкае аддзяленне Віцебскага педагагічнага інстытута, стаў майстрам вытворчага навучання — й даў пуцёўку ў жыццё не аднаму маладому керамісту. І сам філіграніў сваё майстэрства як мастак. У гэтым яму паспрыяла дружба з таленавітымі мастакамі вучылішча Анатолем Конгцупам і Валерыем Калтыгіным — прафесіяналамі сваёй справы. Яны дапамаглі ўбачыць Боўдзе ўсе свае таямніцы як мастаку.

*Я думаю: хто ёсць ганчар*
*І з кім яго сябруе дар?*
*Ганчар, — а ён душой*
*мастак, —*
*Мне б адказаў, напэўна, так:*
*"Мой першы сябра —*
*творчы дух,*
*Другі — ганчарны добры круг,*
*Два сябры — кожная далонь,*
*А пяты сябра мой — агонь".*

Тры гады пры Бабруйскім цэнтры культуры працуе гаспадарчаразліковае аб'яднанне "Стары майстар", якое стала народным. У ім сабраліся людзі, якія спяваюць мастацтва. Сярод іх і Юрый Боўда. Кіраўнік аб'яднання Леанід Няхайчык аўтарытэтна адзначае:

— Юрый Іванавіч — гордасць наша. Яго самабытныя работы былі адзначаны на салідных выстаўках народнага мастацтва не толькі ў Беларусі, але ў Галандыі, Германіі, Францыі. І ў паўсядзённай рабоце нашага аб'яднання нам без Боўды не абысціся.

"Стары майстар" выконвае заказы па афармленню ўстаноў культуры вобласці. Далёка не трэба хадзіць: узяць хоць бы Бабруйскую цэнтральную бібліятэку, побач з якой знаходзіцца невялічкая майстэрня Боўды. У гасцінай бібліятэкі Юрый Іванавіч зрабіў дзівосны камін, адзін выгляд якога ўжо настройвае на высокія думкі. А майстар шчыруе над новымі сваімі задумкамі:

*Няхай, як планета, твой*
*верціцца круг,*
*Няхай прадаўжаецца светлы*
*твой век,*
*І дзіва сыходзіць заўжды*
*з тваіх рук,*
*Як з божых далоняў сышоў*
*чалавек.*

**Іван ПЕХЦЕРАЎ.**